# Лекі "Мартаўскіх катоў"

**15 красавіка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў прайшла прэс-канферэнцыя з нагоды правядзення VI Міжнароднай дабрачыннай выставы "Мартаўскія каты".**

Выства "Мартаўскія каты" арганізаваная Міжнародным грамадскім аб'яднаннем мастакоў і мастацтвазнаўцаў "Майстар". Як стала вядома з прэс-канферэнцыі, гэтае мерапрыемства будзе праводзіцца з 17 красавіка па 2 мая 2009 года ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры". Па словах кіраўніка названай арганізацыі Сяргея Крыштаповіча, у выставе прымуць удзел 126 мастакоў з шасці краін свету (Беларусь, Літва, Сербія, Расія, ЗША, Польшча), якія прадставяць каля 200 сваіх карцін. Акрамя таго, сёлета тут будзе выстаўлена амаль 200 скульптур кошак, прывезеных спецыяльна для гэтай выставы замежным калекцыянерам.

"Калі ў 2004 годзе мы з цяжкасцю знайшлі 19 мастакоў, якія адлюстроўвалі на палотнах вобразы катоў, то ў 2009 годзе іх колькасць складае 193. Людзі так захапіліся гэтай справай, што нават мэблю пачалі распісваць кошкамі. Але, на жаль, у нас няма памяшкання, каб паказаць наведвальнікам такія экспанаты", — зазначыў С.Крыштаповіч.

На прэс-канферэнцыі прысутнічалі куратар выставы Ала Нароўская, беларускія мастакі (С.Касцючэнка, Т.Гардашнікава і інш.), прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. А вядомы мастак Сяргей Стэльмашонак нават публічна выказаў сваю любоў да кошак: "Я дваццаць гадоў малюю катоў і больш нічога. Гэта мая адзіная і любімая тэма". Дарэчы, у рамках выставы мастак прадставіць праект першай сусветнай валюты наміналам у адзін "коцік". На думку С.Стэльмашонка, новая валюта ("коцікі") будзе выклікаць толькі станоўчыя эмоцыі ў жыхароў розных краін.

Кажуць, што кошкі лечаць людзей, забіраюць ад іх адмоўную энергію. У наш час гэтыя жывёлы на самай справе дапамагаюць акрыяць пасля цяжкіх хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы. Дабрачынная выстава будзе праводзіцца ў падтрымку праграмы Беларускага дзіцячага фонду "Дзіцячае сэрца". З першых дзён Міжнароднае грамадскае аб'яднанне мастакоў і мастацтвазнаўцаў "Майстар" з'яўлялася адным з удзельнікаў гэтай праграмы. Пасля выставы напрыканцы мая адбудзецца аўкцыён, на якім будуць прададзены некаторыя карціны, а грошы пойдуць у сем'і цяжкахворых людзей. На прэс-канферэнцыі прысутнічала каардынатар праграмы Лідзія Мікалаеўна Літвіновіч, якая падкрэсліла важнасць выставы: "Трэба разумець, што самае галоўнае ў лячэнні дзяцей з прыроджанымі парокамі сэрца — гэта рэабілітацыйны перыяд. Самі аперацыі для дзяцей праводзяцца бясплатна. Аднак для поўнага выздараўлення патрэбны медыкаменты (часам вельмі дарагія), вітаміны і проста паўнацэннае харчаванне. Не ўсе сем'і могуць знайсці неабходную суму. Таму выстава "Мартаўскія каты" для многіх стала апошняй надзеяй".

Кожны год за сродкі фонду аздараўляецца каля 70 чалавек, але хворых дзяцей намнога больш. У гэтым годзе аперацыі будуць зроблены Карыне Малафей (пасёлак Жамчужны), Кірылу Кляпацкаму (Полацк ) і Валянціне Аўсяннікавай (Жодзіна). Карыне няма яшчэ і года, яна з двойні. Так здарылася, што сястрычка нарадзілася здаровай, а ў Карыны цяжкі прыроджаны парок сэрца. У лютым дзяўчынцы была зроблена першая аперацыя, аднак для поўнага выздараўлення Карыне патрэбна прайсці яшчэ не праз адну аперацыю і вельмі складанае лячэнне. Кірылу Кляпацкаму адзін год і чатыры месяцы. У яго рэдкі цяжкі прыроджаны парок сэрца. Яшчэ некалькі гадоў назад такія дзеці паміралі праз некалькі месяцаў пасля нараджэння. Сёння беларускія кардыяхірургі ўмеюць рабіць складаныя аперацыі, і жыццё Кірыла было выратавана. Аднак хлопчыку таксама патрэбны дадатковыя аперацыі і доўгае лячэнне. За тры гады жыцця маленькай Валянціне Аўсяннікавай ужо былі зроблены тры аперацыі, дзве з якіх праводзіліся ў Беларусі ўпершыню. Праз 2—3 гады дзяўчынцы спатрэбіцца яшчэ адна аперацыя...

Паважаныя чытачы "Настаўніцкай газеты", вы таксама можаце падтрымаць праграму Беларускага дзіцячага фонду. Вельмі важна, каб чалавек любіў мастацтва, захапляўся яго шэдэўрамі. А калі гэта яшчэ дапамагае вылечыцца ад цяжкай хваробы, то можна гаварыць пра ідэальнае суіснаванне людзей і прыгожага.

**Вольга ПЯТРОВІЧ.**



НА ЗДЫМКУ: новая валюта "коцікі" ад С.Стэльмашонка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ